

**Паўлава Сафія Антонаўна**
Кандыдат філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў



**Саітава Валянціна Іванаўна**
Кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 37.091.3:[01+02]:378.4[008+7](476-25)

*С. А. Паўлава, В. І. Саітава*

# Сучасныя практыка-арыентаваныя педагагічныя тэхналогіі падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчнай сферы

*Разгледжаны інавацыйныя тэхналогіі, якія прымяняюцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў пры выкладанні дысцыплін бібліятэчна-бібліяграфічнага цыкла. Прааналізавана праектнае навучанне як сукупнасць інтэрактыўных метадаў, паказана эфектыўнасць практыка-арыентаванага падыходу ў адукацыйным працэсе.*

Сёння праблема прафесійнай кампетэнтнасці ў працэсе забеспячэння грамадства высокакваліфікаванымі кадрамі разглядаецца як ключавая. Пачатак яе аналізу паклалі расійскія навукоўцы (В. А. Болатаў, І. А. Зімняя, Н. В. Кузьміна, А. К. Маркава). Навыкі студэнтаў і выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі даследаваны беларускімі вучонымі (А. І. Жук, В. Л. Жук, Н. М. Кошаль, А. В. Макараў, Ю. М. Галкоўская), аднак галіна падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы вывучана недастаткова.

У сучаснай прафесійнай адукацыі цэнтральнае месца займаюць не столькі веды, колькі спосабы, сродкі дзейнасці, алгарытм вы-

рашэння псіхолага-педагагічных задач. У нашай краіне акцэнт у аднаўленні зместу падрыхтоўкі спецыялістаў робіцца на ўзмацненні практыкаарыентаванасці. Прафесійныя кампетэнцыі бібліятэкара з'яўляюцца інтэграваным вынікам навучання, праяўляюцца і існуюць практычна і звязаны са значнай колькасцю аб'ектаў дзейнасці, нарошчваюцца сумесна з іншымі ўменнямі. Іншымі словамі, пры высокім узроўні сфарміраванасці прафесійных кампетэнцый студэнт павінен быць здольны да самастойнай працы.

Асаблівасцю выкладання агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін для студэнтаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (далей – ФІДК) установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» з'яўляецца іх непасрэдная практыкаарыентаванасць. Такі падыход дазваляе не толькі акрэсліваць вызначанае кола тэарэтычных пытанняў па кожнай дысцыпліне, але і фарміраваць у студэнтаў навыкі практычнай работы ў галіне кіравання чалавечымі рэсурсамі арганізацыі, уменне прымяняць атрыманыя веды.

Выпускнікі ФІДК ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі на рынку інтэлектуальнай працы паспяховыя ў тым выпадку, калі валодаюць грунтоўнымі тэарэтычнымі, тэхналагічнымі, кіраўнічымі ведамі і ўменнямі, прафесійнай мабільнасцю, здольнасцю адаптавацца да хутка зменлівых умоў, маюць сфарміраваныя ключавыя прафесійныя кампетэнцыі. Актуалізуецца задача аднаўлення зместу адукацыйнага працэсу праз узмацненне яго практычнай накіраванасці.

Практыка-арыентаваны падыход не змяншае значнасці тэарэтычнага блоку дысцыплін, аднак дае магчымасць мяняць тэхналогію і пераходзіць ад перадачы ведаў да навучання з набыццём досведу.

У сістэме прафесійнай адукацыі існуюць розныя падыходы да практыкаарыентаванасці. Найбольш вузкі, па нашым меркаванні, звязвае практыка-арыентаванае навучанне з фарміраваннем прафесійнага вопыту студэнтаў пры іх паглыбленні ў асяроддзе падчас вучэбнай, вытворчай і пераддыпломнай практыкі [1]. Нельга не пагадзіцца з тым, што яе праходжанне садзейнічае фарміраванню ў студэнтаў уяўленняў пра прафесію, пра патрабаванні, якія прад'яўляюцца да канкрэтных работнікаў, спрыяе асэнсаванню асабовай ролі ў розных кірунках дзейнасці бібліятэк. Разам з тым практыка-арыентаваны падыход мадэлявання фрагментаў будучай працы пры выкарыстанні магчымасцей кантэкставага (прафесійна накіраванага) навучання прадугледжвае прымяненне прафесійна арыентаваных тэхналогій і методык засваення профільных і няпрофільных дысцыплін [3].

Найбольш шырокі погляд у дзейнасна-кампетэнтнаснай парадыгме сфармуляваў Ф. Г. Ялалаў [4]. Вучоны лічыць, што практыка-арыентаваная адукацыя скіравана на набыццё акрамя ведаў, уменняў, навыкаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

досведу практычнай дзейнасці з мэтай дасягнуць прафесійных і сацыяльна значных кампетэнцый. Гэта забяспечвае ўключэнне студэнтаў у работу і іх актыўнасць. Матывацыя да вывучэння тэарэтычнага матэрыялу ідзе ад патрэбы ў вырашэнні практычнай задачы. Аўтар абгрунтаваў дзейнасна-кампетэнтнасны падыход як разнавіднасць практыка-арыентаванага, што прадугледжвае выкарыстанне актыўных метадаў навучання, ахарактарызаваных нестандартнымі формамі і метадамі. Яны развіваюць у студэнтаў навыкі самастойнай інтэлектуальна-практычнай дзейнасці, актывізуюць узаемадзеянне суб'ектаў адукацыйнага працэсу.

Практыка-арыентаванае навучанне разглядаецца як сістэма паэтапнага ўключэння студэнтаў у працэс пазнання фундаментальных прадметных ведаў праз засваенне тэхналогій іх якаснага і колькаснага адбору, сістэматызацыі і ацэньвання іх верагоднасці. Комплекс прафесійна арыентаваных метадаў навучання садзейнічае фарміраванню кампетэнцый, здольнасцей да рэфлексіі і самаактуалізацыі. Тут можна гаварыць пра дуальную адукацыю: яе элементы паступова ўводзяцца ў навучальны працэс, а сутнасць заключаецца ў збалансаванні тэорыі і практыкі.

Змест і метады дысцыпліны падпарадкаваны дыдактычным заканамернасцям практыка-арыентаванага падыходу і пабудаваны адпаведна з этапамі дасягнення канчатковага прадукту навучання. Гэта азначае пераразмеркаванне суадносін тэарэтычнай, практычнай і метадычнай інфармацыі ў галіне фарміравання кампетэнцый.

Сістэма агульнапрафесійных і спецыяльных вучэбных дысцыплін, якія выкладаюцца на кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ФІДК, іх метадычнае забеспячэнне ўяўляюць сабой структурна-лагічную мадэль працэсу развіцця прафесійна значных кампетэнцый спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, што адлюстравана ў вучэбна-метадычным комплексе. Прапанаваная мадэль прадстаўлена як адукацыйны праект, г. зн. форма арганізацыі заняткаў, што прадугледжвае сумесны характар работы ўсіх яго ўдзельнікаў, накіраваны на атрыманне канкрэтных адказаў, вырашэнне тэарэтычнай або практычнай праблемы. Вынік можна ўбачыць, асэнсаваць, прымяніць у рэальнай практычнай дзейнасці. Метад праектаў арыентаваны на самастойную дзейнасць студэнтаў – індывідуальную, парную, групавую, якую яны выконваюць на працягу вызначанага часу. Для творчай работы прапанаваны камплект дыдактычных матэрыялаў (кіраўнічыя практыкумы, вучэбныя трэнінгі, дзелавыя гульні, варыянты канфліктных сітуацый і праблемныя заданні для аналізу і рашэння, развіваючыя тэсты, эсэ і г. д.).

Перад пачаткам праектнага навучання складаецца мадэль дысцыпліны – рабочая праграма, дзе ўсебакова раскрываюцца яе зна-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

чэнне для дадзенай спецыяльнасці, міжпрадметныя сувязі, аб'ём, змест тэарэтычнай і практычнай частак, формы арганізацыі вучэбнага працэсу, кантролю і тэхналогіі. Акрамя праграмы распрацаваны метадычныя комплексы, у якіх канкрэтызуюцца віды дзейнасці, што складаюць базіс прафесійных кампетэнцый на аснове практыка-арыентаванага падыходу. Гэта вызначае выбар форм і метадаў, стварае структуру вучэбнага працэсу.

Засваенне вучэбных дысцыплін прадугледжвае тэарэтычнае навучанне (лекцыі, семінарскія, практычныя, лабараторныя заняткі, тэставыя заданні і самастойная работа студэнтаў). Праектная адукацыя ўтрымлівае ў сабе сукупнасць інтэрактыўных метадаў (засваенне паняццяў, праблемнае навучанне, мазгавы штурм, кейс-стадзі[1]). Па шэрагу вучэбных дысцыплін, распрацаваных на кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, кожны модуль завяршаецца прадстаўленнем монапраектаў, якія рыхтуюцца ў камандных групах. Тэхналогія правядзення заняткаў уяўляе сабой прымяненне комплексу інтэрактыўных метадаў. Прывядзём некаторыя прыклады. Метад засваення паняційнага апарату дысцыпліны выкарыстоўваецца ў тэарэтычным модулі дысцыплін. Яго мэта – развіццё індывідуальнага мыслення, рэфлексіі, асэнсавання студэнтамі канцэпцый, каштоўнасных арыентацый, стварэнне кожным удзельнікам педагагічнага працэсу свайго асабістага разумення таго ці іншага паняцця, абмен поглядамі.

У межах дысцыпліны «Бібліятэчны менеджмент» метад рэалізуецца ў некалькі этапаў. На першым з іх – гэта акрэсліванне паняцця – на занятках выкладчык прапануе студэнтам работу з даведачнай літаратурай, дзе яны знаходзяць універсальнае вызначэнне і запісваюць яго ў слоўнік. Падчас самастойнай работы, г. зн. на другім этапе, робіцца падбор падобных па змесце і аб'ёме паняццяў (па адным з кожнай тэмы). На трэцім адбываецца пошук супрацьлеглых дэфініцый. Такім чынам студэнт складае ўласны тлумачальны слоўнік.

Актуальныя тэрміны дысцыпліны «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя» студэнты вывучаюць па падручніку Т. В. Кузьмініч [2], у якім прыведзены слоўнік, схемы і табліцы, што «дазваляюць больш выразна паказаць сувязі тэарэтычных абагульненняў і даных практычнай дзейнасці» [2, с. 9]. Гэтыя матэрыялы ўжываюцца пры падрыхтоўцы да семінараў, выканання практычных і самастойных работ.

Для запамінання неабходна замацаваць асацыятыўныя сувязі паміж тэрмінам і дэфініцыяй. Для гэтага прапанаваны тэставыя заданні, у якіх тэрмін выкарыстоўваецца ў розных кантэкстах.

[1] Кейс-стадзі (англ. Case study) – сістэма навучання, якая базіруецца на аналізе, абмеркаванні і рашэнні рэальных або змадэляваных сітуацый.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пісьмовыя бліц-тэсты праводзяцца падчас аўдыторных заняткаў, іх праверка дапамагае выявіць узровень засваення лекцыйнага матэрыялу, назапашванне студэнтамі прафесійнай лексікі. Калі ў бліц-тэстах пераважае рэпрадуктыўны метад арганізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, то іншыя заданні па засваенні паняццяў і адпаведныя формы кантролю (падрыхтоўка эсэ, колаў Эйлера, складанне красворда, электронныя прэзентацыі, удзел у індывідуальных і групавых гутарках) заснаваны на выкарыстанні кагнітыўна-пошукавага і кагнітыўна-крытычнага метадаў. Напрыклад, студэнты ствараюць эсэ, у якім параўноўваюць ключавую дэфініцыю «бібліяграфія» ў сучасных нарматыўных, вучэбных і даведачных выданнях – беларускіх, расійскіх, заходнееўрапейскіх, паўночнаамерыканскіх. Работы абмяркоўваюцца на семінарскіх занятках, аўтарам лепшых з іх прапануецца прыняць удзел у навуковай студэнцкай канферэнцыі.

Паняційны апарат бібліяграфічных рэсурсаў даволі складаны, аднак засвоіць яго вельмі важна, бо ён адносіцца да практычнай дзейнасці. Першапачаткова ён спасцігаецца і замацоўваецца падчас аўдыторных заняткаў, асабліва практычных, на якіх студэнты працуюць з рэальнымі бібліяграфічнымі рэсурсамі розных форм, тыпаў, жанраў, відаў. Акрамя таго, навучэнцы выконваюць самастойную работу па тэмах, прысвечаных бібліяграфічнай прадукцыі. Для яе кантролю выкарыстоўваюцца індывідуальныя гутаркі, тэсты і колы Эйлера. Апошнія як геаметрычная схема візуалізуюць адносіны паміж мноствам і яго часткамі, дапамагаюць знаходзіць і наглядна паказваць лагічныя сувязі паміж паняццямі, адпаведнымі разнастайнасці сучасных бібліяграфічных рэсурсаў.

Засвоены паняційны апарат садзейнічае фарміраванню прафесійнай мовы, дазваляе студэнту паспяхова ўключацца ў камунікацыю ў працэсе навучання, праходжання вытворчай практыкі, удзельнічаць у навуковых даследаваннях, а таксама падчас вучобы пачынаць працу ў бібліятэках.

Тэхналагічныя і арганізацыйна-кіраўнічыя модулі ў вучэбных дысцыплінах і адпаведныя раздзелы ў вучэбна-метадычных комплексах прадстаўлены шырокім спектрам педагагічных тэхналогій, што ўжываюцца, метадаў і форм арганізацыі вучэбнай дзейнасці студэнтаў. Іх вызначальная характарыстыка – арыентаванасць на інавацыйную бібліятэчную практыку.

Па шэрагу дысцыплін распрацаваны вучэбныя трэнінгі. Напрыклад, тэматыка трэнінгаў па бібліятэчным менеджменце звязана з дыскурсіўным бачаннем кіраўнічай дзейнасці і яе адлюстраваннем у структурна-лагічных мадэлях, малюнках, інфаграфіцы. Такім чынам, студэнты набываюць навыкі мадэлявання, развіцця абстрактнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мыслення і вобразна-лагічнага бачання працэсаў кіраўнічай дзейнасці як найважнейшай якасці менеджара. На практычных занятках па тэме «Кіраўнічая сістэма: сутнасць і вобраз» студэнты прадстаўляюць структурна-лагічную мадэль кіравання пэўнай бібліятэкай. Выкананне гэтага задання дае магчымасць замацоўваць веды пра сістэмнасць, а таксама пра структурную пабудову арганізацыі. Практычныя заняткі па вышэйназванай дысцыпліне накіраваны на падрыхтоўку міні-праектаў па кожным модулі. Навучанне завяршаецца стварэннем комплекснага праекта, у якім інтэгруюцца веды, уменні і кампетэнцыі, набытыя студэнтамі пры выкананні міні-праектаў. Падобная методыка выкарыстоўваецца і пры выкладанні іншых вучэбных дысцыплін бібліятэчна-бібліяграфічнага цыкла.

Падрыхтоўка і рэалізацыя комплексных праектаў адбываецца ў пяць этапаў:

*1. Арганізацыя творчых груп.* Студэнты аб'ядноўваюцца ў творчыя групы, у кожнай з якіх вылучаецца каардынатар. Ён кіруе і кантралюе ўдзел астатніх у распрацоўцы праекта, кансультуецца з работнікамі бібліятэк, выкладчыкамі. Для кожнай творчай групы педагогі інтэгруюць заданні вучэбнай і пазавучэбнай, самастойнай работы студэнтаў, арыентуюць іх на супрацоўніцтва. У групах адбываецца размеркаванне абавязкаў з улікам патэнцыяльных асабовых здольнасцей удзельнікаў.

*2. Выбар творчымі групамі тэм праектаў.* Кожная творчая група разам з метадыстамі, работнікамі аддзелаў абслугоўвання бібліятэк выбіраюць тэмы мультыпраектаў, абмяркоўваюць магчымыя крыніцы інфармацыі, прагназуюць канчатковы вынік.

*3. Вызначэнне творчай групай відаў дзейнасці і стварэнне плана рэалізацыі мультыпраекта.* Каардынатар групы разам з выкладчыкам (пры неабходнасці) размяркоўвае віды дзейнасці паміж удзельнікамі праекта, пасля чаго складаецца план работы і прызначаюцца адказныя за кожную пазіцыю, акрэсліваецца тэрмін выканання.

*4. Рэалізацыя планаў мультыпраектаў.* Гэты этап – самы інтэнсіўны і творчы: здзяйсняецца непасрэдная распрацоўка праекта ў бібліятэках. Студэнты назапашваюць інфармацыю, працуюць з ёй, даследуюць праблемы, абмяркоўваюць розныя варыянты афармлення і прадастаўляюць праекты. Кожны ўдзельнік групы ўносіць асабісты ўклад у агульную справу. Сумесная праца над праектам дае магчымасць стварыць пазітыўную ўзаемазалежнасць студэнтаў і забяспечвае індывідуальную ацэнку работы кожнага ўдзельніка і групы ўвогуле.

*5. Прэзентацыя праектаў.* Абарона мультыпраекта першапачаткова адбываецца на практычных занятках у студэнцкіх групах.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Формай прэзентацыі з'яўляецца круглы стол, куды запрошаны выкладчыкі факультэта і прадстаўнікі бібліятэк.

Пры абароне праекта ўлічваюцца:

– арыгінальнасць і якасць матэрыялу;

– аб'ём і глыбіня ведаў па тэме, эрудыцыя, міжпрадметныя сувязі;

– культура мовы, выкарыстанне наглядных сродкаў;

– адказы на пытанні, паўната, аргументаванасць.

Практыка-арыентаванае навучанне паказвае студэнтам шляхі і механізмы выяўлення і паспяховага выкарыстання дасягненняў бібліятэчна-інфармацыйнай навукі і практыкі, стратэгічных кірункаў, праграм, задач, што вырашаюцца структурамі соцыуму з найбліжэйшага атачэння бібліятэкі, а таксама найбуйнейшымі сусветнымі цэнтрамі, якія вызначаюць мэты глабальнага развіцця сучаснага свету і фінансуюць выдатныя праекты.

Кафедра бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ФІДК унесла значны ўклад ва ўвядзенне тэхналогіі праектаў у адукацыйны працэс і бібліятэчную практыку. Студэнты на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (далей – БДУКМ) дэманстравалі грамадскасці свае праекты, падрыхтаваныя пад кіраўніцтвам прафесараў С. А. Паўлавай і В. І. Саітавай. Работы карысталіся вялікім попытам у бібліятэках. Цяпер, калі праектаванне знаходзіцца на піку бібліятэчных тэхналогій, падрыхтоўка будучых спецыялістаў па гэтым напрамку набыла асаблівае значэнне.

Высокая эфектыўнасць практыка-арыентаванага навучання дасягаецца ў працэсе рэалізацыі буйных сацыяльна значных праектаў. Яны адзінкавыя і нячастыя, аднак становяцца яркай падзеяй у культурным жыцці краіны і з'яўляюцца добрым узорам для авалодання праектнай тэхналогіяй. Прыклад – работа «Воссоздаем историю вместе», ініцыянаваная студэнткай завочнага аддзялення Н. А. Шамалавай, цяпер дырэктарам ДУК «Цэнтралізаваная сетка публічных бібліятэк Слаўгарадскага раёна». Актуальнасць гэтай задумы звязана з пошукам новых стымулаў для развіцця турызму і інвестыцыйнай прывабнасці Слаўгарадскага раёна. Аб'ектам творчай працы даследчыцы сталі гісторыка-культурныя помнікі каля а/г Лясная, звязаныя з перамогай рускага войска над шведскім корпусам 28 верасня 1708 г. падчас Паўночнай вайны. Мэта праекта – стварэнне музейнай экспазіцыі пад адкрытым небам, прысвечанай бітве пад Лясной, і інтэрактыўнай анімацыйнай праграмы «По следам Северной войны» непасрэдна на месцы гістарычнай падзеі. Супрацоўніцтва з раённымі ўладамі, з партнёрамі сацыякультурнай сферы пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза прыводзіць да наступных вынікаў.

Праз прамоцыю бібліятэчных паслуг паляпшаецца імідж Ляснянскай бібліятэкі-музея, пашыраецца турыстычная і экскурсійная дзейнасць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захоўваецца і папулярызуецца культурная і гістарычная спадчына, што сведчыць пра ўзмацненне сацыяльнага эфекту дзейнасці сацыякультурных устаноў.

Відавочны эканамічны эфект: чытачам прадастаўляюцца якасныя бібліятэчныя паслугі; даходы мясцовага насельніцтва, рамеснікаў і сыравараў растуць у сувязі з прыездам наведвальнікаў; у раённы бюджэт прыцягваюцца дадатковыя сродкі за кошт росту колькасці гасцей і правядзення экскурсійнай дзейнасці. Дзякуючы адкрыццю музея пад адкрытым небам распрацаваны новы турыстычны маршрут, штогод праводзяцца фестывалі, прысвечаныя бітве пад Лясной.

Рэалізаваны мегапраект «Диалог поэтов: русские стихи в белорусских переводах, белорусские стихи в русских переводах», падрыхтаваны разам з Расійскім цэнтрам навукі і культуры ў Мінску з удзелам Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. У яго межах у бібліятэку БДУКМ была перададзена калекцыя кніг і дыскаў па мастацтве.

Студэнты і выкладчыкі ФІДК удзельнічалі ў рэалізацыі міжнароднага праекта «Беларускія смаляне, смаленскія беларусы», ініцыянаванага бібліятэкай Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яго плёнам стала папаўненне карпаратыўнай базы даных, прысвечанай ураджэнцам і дзеячам беларуска-смаленскага памежжа, і выданне біябібліяграфічнага даведніка.

З 2017 г. прадстаўнікі ФІДК удзельнічаюць у падрыхтоўцы і правядзенні штогадовай міжнароднай сацыякультурнай акцыі «Бібліяноч» у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. «Бібліяноч» як брэндавае мерапрыемства ахапіла мноства бібліятэк нашай краіны, даючы ім магчымасць крэатыўна раскрываць свае фонды і багацці інфармацыйных рэсурсаў глабальнага свету, паказваць разнастайныя і незвычайныя фарматы падачы інфармацыі. Цікавасць наведвальнікаў да мерапрыемства пацвярджае трывалую пазіцыю Беларусі, якая займае 7-е месца ў свеце па колькасці бібліятэк на 1 млн жыхароў.

У партнёрстве са спецыялістамі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі студэнты і выкладчыкі ствараюць сцэнарый будучага свята, шукаюць партнёраў, выступаюць удзельнікамі і вядучымі на асобных пляцоўках, працуюць валанцёрамі. Так, студэнтка Анастасія Кананові́ч правяла на пляцоўцы «Інтэлектуальны эпіцэнтр» на «Бібліяночы-2017» пазнавальна-забаўляльныя гульні і тэсты.

На «Бібліяночы-2019», якая праходзіла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі на тэму «БиблиоLIVE», выкладчыкі і студэнты ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы і правядзенні праграм на некалькіх пляцоўках. Яны прыклалі вялікія інтэлектуальныя і творчыя намаганні ў працэсе праектавання, які ўключаў: генерыраванне арыгінальных ідэй; абгрунтаванне канцэпцый; стварэнне сцэнарыяў; пошук партнёраў; кансультацыі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

са спецыялістамі аддзела культурна-відовішчнай дзейнасці; рэпетыцыі выступоўцаў і інш.

Незвычайны эстэтычны і эматыўны ўзровень адкрыцця свята «БиблиоLIVE» быў створаны паказам эксклюзіўных вячэрніх сукенак моднага дома «Юнона» і дэфіле, мадэлі дэманстравалі і студэнткі 1–4-га курсаў факультэта – будучыя бібліятэкары. Гэтыя паказы адбыліся ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і былі падрыхтаваны заснавальніцай і дырэктарам «Юноны», выпускніцай ФІДК Інэсай Семчанковай і дырэктарам мадэльнага агенцтва «Тамара» Тамарай Ганчаровай. На адкрыцці Інэса Мікалаеўна падкрэсліла, што для яе як выпускніцы факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый удзел у паказе – гэта вялікі гонар і жаданне падтрымаць прафесію вялікага сацыяльнага значэння.

З выступлення рок-групы «Каманда Ы» пад кіраўніцтвам студэнта Паўла Еўтухова пачалася праца пляцоўкі «MusicLIVE». Прагучалі яго аўтарскія кампазіцыі, якія знайшлі жывы водгук у слухачоў. У зале беларускай літаратуры студэнткі Юлія Крыкун і Анастасія Волчак правялі пазнавальную інтэрактыўную віктарыну «Размаўляй са мной пабеларуску».

Актыўна вядзецца падрыхтоўка да ўдзелу ў «Бібліяночы-2020». Многія студэнцкія праекты прымяняюцца ў дыпломных работах, ажыццяўляюцца ў бібліятэках. Найлепшыя з іх асветлены ў электронных і друкаваных СМІ, прадстаўлены на навуковых канферэнцыях, атрымліваюць высокія ўзнагароды на рэспубліканскіх конкурсах студэнцкіх работ.

Педагагічныя ўмовы і сродкі праектнай дзейнасці паспяхова рэалізуюцца ў межах вучэбных дысцыплін «Піяр і бібліятэчная рэклама», «Сацыякультурная праектная дзейнасць», «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» і інш.

Выкладчыкі кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці падтрымліваюць сувязі з многімі бібліятэкамі, што важна для інавацыйнай актуалізацыі вучэбных дысцыплін, якія суправаджаюцца бібліятэчнай практыкай. У прыватнасці, Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі – філіял кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый, праводзяць для выкладчыкаў ФІДК цыклы навукова-практычных семінараў, дзе абмяркоўваюцца найноўшыя дасягненні ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці і кірункаў практыка-арыентаванай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Праектная дзейнасць стала асноўнай для дасягнення бібліятэкамі пастаўленых мэт, яе ўвядзенне ў адукацыйны працэс паглыбляе практычны характар навучання. Гэты метад дазваляе студэнтам авалодаць праектнай культурай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

набыць кампетэнцыі, неабходныя для вырашэння задач высокай сацыякультурнай вартасці.

Прымяненне практыка-арыентаваных тэхналогій у адукацыйнай дзейнасці ўмацоўвае ў студэнтаў перакананасць у правільным прафесійным выбары, раскрывае шматграннасць бібліятэчнай практыкі і, як сцвярджаюць самі навучэнцы, надае ўпэўненасці, удасканальвае, стымулюе пазнавальную і сацыяльную актыўнасць.

1. *Ветров, Ю.* Практико-ориентированный подход / Ю. Ветров, Н. К. Клушина // Высшее образование в России. – 2002. – № 6. – С. 43–46.

2. *Кузьмініч, Т. В.* Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : падручнік / Т. В. Кузьмініч. – Мінск : РІВШ, 2018. – 216 с.

3. *Солянкина, Л. Е.* Проектирование и реализация модели развития профессиональной компетентности специалиста в практико-ориентированной образовательной среде / Л. Е. Солянкина // Известия Волгоградского гос. пед. ун-та. – 2011. – № 1. – С. 42–46.

4. *Ялалов, Ф. Г.* Деятельностно-компетентностный подход к практико-ориентированному образованию / Ф. Г. Ялалов // Высшее образование в России. – 2008. – № 1. – С. 89–93.

*S. Paulava, V. Saitava*

**Modern practice-oriented pedagogical technologies of specialists' training in the field of library services**

*Innovative technologies used at the Belarusian State University of Culture and Arts in teaching the disciplines of the library and bibliographic cycle are considered. Project learning as a set of interactive methods is analyzed; the effectiveness of the practice-oriented approach in the educational process is shown.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 26.03.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ